**УДК 272(450)-9**



***© Алена Паддубская***
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

***© Alena Paddubskaya***
*Associate Professor of the Modern and Contemporary history of Belarus department of Faculty of history of Belarusian State University, PhD in history, Associate Professor*
*e-mail: paddubskaja@tut.by*

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ ПАРТЫІ ІТАЛІІ НА ЗАКЛЮЧНЫМ ЭТАПЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць хрысціянскіх партый Італіі на заключным этапе Другой сусветнай вайны. Аналізуецца праблема станаўлення Хрысціянска-дэмакратычнай партыі Італіі, развіццё левых хрысціянскіх партый — Сацыяльна-хрысціянскай партыі і Хрысціянскай левай партыі. Беглы аналіз гэтых момантаў дапаможа, як падаецца, наблізіцца да разумення палітычнага жыцця Італіі дадзенага перыяду.*

Хрысціянская дэмакратыя прадстаўляе з сябе палітычны рух і адпавядаючую гэтаму руху свядомасць, якія абапіраюцца ў асноўным на хрысціянскую этыку. Вытокі хрысціянскай дэмакратыі адносяцца да канца XVIII — пачатку XIX ст., а палітычныя партыі і групіроўкі, якія называліся «хрысціянскімі», «хрысціянска-сацыяльнымі» ці «хрысціянска-дэмакратычнымі», сталі ўзнікаць у апошняй трацiне XIX ст. у Бельгіі, Францыі, Германіі і іншых краінах.

Ужо ў той час тэрмін «хрысціянская дэмакратыя» не быў новым, бо з першай паловы XIX ст. яго выкарыстоўвалі як аўтары-каталікі, так і некаталікі, укладаючы розны змест. Але толькі ў апошняе дзесяцігоддзе XIX ст., пасля з'яўлення папскай энцыклікі «Rerum novarum», гэтым тэрмінам афіцыйна сталі абазначаць палітычную плынь [1]. У розных еўрапейскіх краінах хрысціянскімі дэмакратамі сталі называць тых каталікоў, якія пад уплывам «Rerum novarum» выступілі за актывізацыю каталіцкага прафсаюзнага руху, а таксама за дзейсную падтрымку рэспубліканскага ладу [2, с. 295].

У 1901 г. пантыфік Леў XIII выдаў энцыкліку «Graves de communi», якую можна назваць «канстытуцыяй» хрысціянскай дэмакратыі [3]. Леў XIII канстатаваў факт, што хрысціянская дэмакратыя з-за сваёй навізны не адразу выклікала давер у паствы і кліру: нехта ўбачыў у ёй пагрозу для свецкай і духоўнай улады. Таму энцыкліка «Graves de communi» павінна была растлумачыць «urbi et orbi» пытанне аб хрысціянскай дэмакратыі, а таксама параіць, як лепш зрабіць гэты рух усебаковым і карысным для дзяржавы.

Па-першае, на думку Папы, хрысціянскія дэмакраты павінны былі абапірацца на асновы хрысціянскай веры і перш за ўсё змагацца за выратаванне чалавечых душ. Па-другое, яны не павінны былі весці барацьбу за ўраўнаванне ўсіх людзей паміж сабой і ў валоданні ўласнасцю, а павінны былі абараняць непахіснасць права прыватнай уласнасці і бараніць натуральнасць грамадскіх саслоўяў і характар дзяржаўнага ладу. Па-трэцяе, адносна рабочага пытання хрысціянска-дэмакратычная тэорыя, па словах Папы, павінна была гарантаваць работніку магчымасць жыць сваёй працай і магчымасць належным чынам выконваць свае маральна-рэлігійныя чалавечыя абавязкі.

Важна зазначыць, што Леў XIII раіў не злоўжываць тэрмінам «хрысціянская дэмакратыя» для выкарыстання ў палітычнай сферы, а перш за ўсё разумець яго як хрысціянскую працу для народа: «Назву хрысціянская дэмакратыя, — кажа гэты дакумент, — трэба разумець такім чынам, што ёй чужая ўсякая палітычная ідэя і яна не азначае нічога новага, толькі дабрачынную хрысціянскую дзейнасць для народа» [4].

Такім чынам, хрысціянская дэмакратыя лічылася ў Ватыкане рухам, які павінен быў адштурхоўвацца ад ідэі хрысціянскага братэрства і адзінства, ахопліваць усе класы грамадства, факусіравацца на пытаннях справядлівасці і маралі, але трымацца пры гэтым у баку ад палітыкі.

Назваўшы вышэйзгаданыя асновы свайго бачання хрысціянскай дэмакратыі, рымскі пантыфік закрыў спрэчкі аб гэтай новай на канец XIX стагоддзя грамадскай ідэі.

Пашырыў сэнс тэрміна «хрысціянская дэмакратыя» каталіцкі тэолаг Дж. Таніёла. Ён у сваім артыкуле «Хрысціянская канцэпцыя дэмакратыі» пісаў: « [Хрысціянская] дэмакратыя — гэта лад, пры якім усе сацыяльныя, прававыя і эканамічныя сілы атрымліваюць найбольш поўнае развіццё і ў сілу сваіх магчымасцей садзейнічаюць дасягненню агульнай карысці» [5, p. 18], пры гэтым «хрысціянская дэмакратыя зусім не імкнецца да маёмаснай роўнасці ці да размеркавання і карыстання маёмасцю на камуністычных пачатках... яна павінна дасягнуць перш за

ўсё сусветнага «памнажэння» маёмасці, а не яе «знішчэння» [5, p. 24]. Адносна ўдзелу хрысціянска-дэмакратычнага руху ў палітыцы тэолаг сцвярджаў: «хрысціянская дэмакратыя можа ў асобных выпадках звяртаць увагу на пытанні палітычнага ладу, але яе існаванне і яе лёс не залежаць ад якой-небудзь формы кіравання» [5, p. 19].

Вынікае, што канцэпцыя хрысціянскай дэмакратыі ў Дж. Таніёла вытрымана ў кансерватыўным і патэрналісцкім духу (пераклікаючыся з думкамі Льва XIII, выказанымі ў яго энцыкліцы «Immortale Dei» (1885) [3]). Гэты артыкул сыграў вялікую ролю ў справе распаўсюджвання тэрміна «хрысціянская дэмакратыя» і дапамог найбольш актыўным у палітычных адносінах групам грамадства разгарнуць сваю дзейнасць (перш за ўсё ў Італіі, дзе артыкул набыў вялікую папулярнасць).

Справа ў тым, што на той момант пытанне ўдзелу насельніцтва Італіі ў сацыяльнай дзейнасці каталіцкай царквы стаяла вельмі востра. Пашыраўшы сваю сацыяльную палітыку на шырокія колы італьянцаў, царква дасягнула поспеху толькі ў некаторых рэгіёнах краіны і толькі сярод пэўных слаёў насельніцтва. Гэта тлумачылася тым, што «старыя» каталіцкія ўтварэнні (перш за ўсё тут маецца на ўвазе арганізацыя «Opera dei Congressi») не знаходзілі шырокай падтрымкі, бо ігнаравалі асноўныя праблемы таго часу (напрыклад, не былі здольныя стварыць арганізацыі прафсаюзнага тыпу; не маглі вызначыцца з мэтай сваёй палітыкі, што была накіраваная галоўным чынам, на вырашэнне «рымскага пытання», далёкага ад большай часткі насельніцтва і г. д.). Так, пступова нарастала супярэчанне паміж грамадствам, якое мадэрнізавалася, і кансерватыўнымі царкоўнымі арганізацыямі і рухамі, якія не давалі адказы на пытанні сучаснасці.

Тады вернікі самі паспрабавалі асэнсаваць новую сітуацыю ў грамадстве, выкарыстоўваючы знаёмыя ім каштоўнасці хрысціянства. Хрысціянскія дэмакраты, абапіраючыся на неабходнасць актыўнага ўдзелу ў кіраванні, разгарнулі барацьбу за абнаўленне. Яны былі шчыра перакананы, што каталіцкія сілы здольныя здзейсніць сацыяльную перабудову. І сапраўды, дзякуючы свайму заклiку праводзіць сацыяльную палітыку ў менш патэрналісцкім духу, і перш за ўсё дзякуючы палітычнай і прафсаюзнай дзейнасці, хрысціянскія дэмакраты сталі выразнікамі імкненняў той часткі насельніцтва, якая да гэтага часу заставалася па-за сферай уплыву каталіцкай думкі і толькі ў нязначнай ступені знаходзілася пад уплывам сацыялістаў.

Росквіт хрысціянскай дэмакратыі прыйшоўся на пасляваенны час, калі яна заняла моцныя пазіцыі ў ФРГ, Бельгіі, Нідэрландах і іншых краінах.

Але заснавальнікам першай у Еўропе хрысціянска-дэмакратычнай партыі стаў у 1919 г. Л. Стурца. Новая партыя атрымала значную падтрымку на выбарах, захоўвала сваю папулярнасць да роспуску фашысцкім урадам у 1926 г. і стала «ідэалагічным падмуркам» для з'яўлення італьянскай Хрысціянска-дэмакратычнай партыі (ХДП) [6, p. 231].

Узнікненне Хрысціянска-дэмакратычнай партыі Італіі адносіцца да другой паловы 1942 г. Летам-восенню 1942 г., калі набліжэнне краху фашызму ўжо адчувалася, будучы лідэр ХДП А. Дэ Гасперы правёў шэраг нелегальных сустрэч з дзеячамі старэйшага і маладога пакалення каталіцкага руху, які сфарміраваўся падчас фашызму, і здолеў аб'яднаць у новай партыі дзеячаў рознага паходжання і поглядаў. Сярод іх былі ветэраны старой партыі Папаляры — С. Ячыні, Дж. Спатара [7, с. 27]; прадстаўнікі каталіцкага прафсаюзнага руху — Дж. Гранкі, А. Грандзі, Дж. Ранэлі; група, што ўтварылася пры Міланскім універсітэце, на чале з П. Мальвесціці, Дж. Малавезі і Э. Фалькам. Сюды далучыліся таксама некаторыя прафесары з Міланскага каталіцкага ўніверсітэта Святога сэрца і інш. [8, с. 129].

І ўжо вясной-летам 1943 г. быў сфармуляваны і атрымаў распаўсюджванне праграмны дакумент партыі пад назвай «Аднаўленчыя ідэі хрысціянскай дэмакратыі» новай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (назву партыі — хрысціянска-дэмакратычная — прапанавалі яшчэ раней, падкрэсліваючы тое, што паняцце «дэмакратыя» з'яўляецца «блізкім для хрысціянаў» [9, p. 124].

Новая Хрысціянска-дэмакратычная партыя выступала за ўсталяванне не толькі палітычнай, але і «эканамічнай» дэмакратыі. Мэтай партыі стала стварэнне ладу, заснаванага збольшага на дробнай уласнасці; ладу, дзе сяляне і працоўныя «знікнуць як клас», ператварыўшыся ва ўладальнікаў зямлі ці саўдзельніка прадпрыемства, а буйныя землеўладальнікі будуць абмежаваныя дзяржавай. У дакуменце тлумачылася неабходнасць «назаўсёды знішчыць прывід беспрацоўя» [10, p. 213]. Батракі і беззямельныя сяляне павінны былі атрымаць зямлю, працоўныя — атрымаць кааператыўныя дамы. Да гэтага выказваліся меркаванні, якія патрабавалі правядзення аграрнай, прамысловай, фінансавай рэформ, дэмакратызацыі палітычных структур.

Эканамічная свабода аб'яўлялася неаддзельнай ад свабоды палітычнай. Праграма казала, што правы асобы могуць быць гарантаваны толькі ва ўмовах палітычнай свабоды. Дзяржава, згодна з праграмай ХДП, з'яўлялася формай арганізацыі «натуральных сацыяльных структур», у якой адначасова праяўляецца як свабода, так і адказнасць асобы

за грамадскую карысць. Рэжымам, які ўвасабляў найбольшую паўнату палітычнай свабоды, абвяшчаўся рэжым дэмакратыі. «Гістарычны досвед, — гаварылася ў праграме, — пацвярджае, што толькі дух братэрства, натхнёны Евангеллем, можа выратаваць народы ад катастрофы, да якой вядуць таталітарныя міфы» [11, с. 43]. Лад, які партыя прапанавала ўсталяваць, называўся «хрысціянскай цывілізацыяй» [12, с. 47–48].

Нельга не заўважыць, што хрысціянскія дэмакраты знаходзіліся пад уплывам ідэй сацыялізму. Яны адлюстраваліся не толькі на ідэалогіі Хрысціянска-дэмакратычнай партыі, але і на адносінах да пытання працоўных (у якім хрысціянскія дэмакраты кіраваліся хутчэй імкненнем да справядлівасці і сацыяльнага абнаўлення, а не пачуццём міласэрнасці і патэрналізмам). З іншага боку, пэўны страх перад сацыялізмам адбіваўся на арганізацыйных метадах і метадах барацьбы ХДП, якіх партыя прытрымлівалася, імкнуўшыся накіраваць каталікоў на шлях стварэння прафсаюзнай арганізацыі і ўмацавання палітычнага ўплыву.

Такім чынам, крыніцамі праграмы ХДП у сваім ідэалагічным плане былі самыя розныя плыні каталіцкай думкі ХХ ст.: афіцыйная сацыяльная дактрына царквы; канцэпцыі лідараў свецкага каталіцкага руху, распрацаваныя імі ў гады фашызму; традыцыйныя ідэі хрысціянскай дэмакратыі пачатку ХХ ст.; антыфашысцкія ідэі падпольных каталіцкіх груп і, нарэшце, канцэпцыі самога А. Дэ Гасперы, што адлюстроўвалі цэнтрысцкую лінію ў каталіцкім руху. ХДП з самага пачатку прадстаўляла самыя розныя сферы руху каталікоў, увабраўшы ў сябе розныя каталіцкія арганізацыі, групы і нават партыі, адны з якіх непасрэдна ўключыліся ў працэс стварэння партыі, іншыя далучыліся толькі на самым апошнім этапе. Партыя з самага пачатку будавалася як агульнанацыянальная кіруючая каталіцкая партыя, здольная «знаходзіцца ва ўладзе», адкрытая да супрацоўніцтва з боку свецкіх палітычных колаў.

А. Дэ Гасперы ставіў сваёй мэтай стварэнне вакол партыі самага шырокага кола эканамічных, сацыяльных і палітычных сіл.

Аднак перашкодай на шляху ажыццяўлення амбіцыйнай ідэі стварэння партыі, якая аб'яднае ўсіх каталікоў Італіі, стала прысутнасць на палітычнай арэне краіны іншых хрысціянскіх палітычных утварэнняў — Хрысціянскай левай партыі (ХЛП) і Сацыяльна-хрысціянскай партыі (СХП).

ХЛП і СХП узніклі ў 1944 г. на базе «Руху камуністычных каталікоў» і «Левахрысціянскага руху». Партыі налічвалі ўсяго каля 20 тыс. чал. і мелі электаральную базу, роўную прыблізна 100–150 тыс. чал. [13, с. 105–106].

Вызначыць іх ролю ў палітычным жыцці Італіі даволі складана. З аднаго боку, іх уплыў адзначаўся і на палітыку дэмахрысціян, і на пазіцыю

Італьянскай камуністычнай партыі, і італьянскіх сацыялістаў. Гэтыя партыі сталі ўнікальнымі, таму што здолелі пераадолець традыцыйныя для каталіцызму агаворкі па пытаннях сацыялізацыі сродкаў вытворчасці, пра гегемонію пралетарыяту і інш. Спалучаючы ў сабе хрысціянскія (традыцыйна важныя для Італіі) і камуністычныя (папулярныя ў пасляваенны перыяд) ідэі, партыі маглі ў тэорыі прэтэндаваць на значнае месца ў палітычным жыцці краіны (хаця ў грамадстве не сціхалі спрэчкі на тэму, ці можна быць адначасова хрысціянінам і прадстаўніком партыі левага кірунку.

Існаванне гэтых хрысціянскіх партый не задавальняла і кіраўніцтва ХДП. Адбывалася гэта па дзвюх прычынах. Па-першае, палітычнае адзінства з'яўлялася ілюстрацыяй канцэпцыі «міжкласавасці» партыі, выказанай А. Дэ Гасперы. Па-другое, існаванне левых каталіцкіх партый магло адцягнуць ад ХДП значную частку электарату, ператварыўшы яе з партыі цэнтра ў правую партыю. Таму перамовы аб аб'яднанні партый з Хрысціянска-дэмакратычнай партыяй Італіі вяліся на працягу ўсяго існавання СХП і Руху каталікоў-камуністаў.

Іх нешматлікасць і недастатковасць колькасці галасоў, якія яны атрымлівалі на выбарах, не дазволілі ХЛП і СХП вытрымаць канкурэнцыю з іншымі партыямі, забяспечыць парламенцкае прадстаўніцтва і стаць важнай палітычнай сілай у пасляваеннай Італіі.

Пад канец 1944 г. кіраўніцтва Сацыяльна-хрысціянскай партыі вырашыла аб’яднацца з ХЛП, а 9 снежня 1944 г. пасля завяршэння свайго першага нацыянальнага з’езда Хрысціянская левая партыя прыняла рашэнне аб самароспуску. Так ХДП дасягнула сваёй мэты — стаць адзінай партыяй італьянскіх каталікоў

Перамогу Хрысціянска-дэмакратычнай партыі Італіі, яе моцныя пазіцыі можна растлумачыць наступным. Па-першае, ХДП карысталася падтрымкай Ватыкана. Гэта іграла важную ролю, улічыўшы рэлігійную свядомасць італьянцаў і той факт, што ў Італіі царква аказвала і працягвае аказваць уплыў на палітычныя сімпатыі выбаршчыкаў. Пры гэтым важна адзначыць, што, нягледзячы на падтрымку царквы, ХДП ніколі не атаясамляліся з ёю. Вернікам была прапанаваная прымальная альтэрнатыва ў выглядзе хрысціянскага грамадства. ХДП прапаноўвала сябе ў якасці каталіцкай партыі і абавязвалася абараняць правы царквы, адначасова з гэтым прыхільнікам свецкай дзяржавы абяцалася незалежная ад царкоўнай іерархіі партыя, дзейнасць якой гарантавала аддзяленне царквы ад дзяржавы.

Па-другое, з-за аб’ектыўных умоў італьянскай палітычнай сістэмы і гетэрагеннасці сацыяльнай базы ХДП, яна выступала як «выразнік

інтарэсаў шырокіх слаёў», як партыя цэнтра, арыентаваная на «адкрыты дыялог з рознымі сегментамі грамадства» [14, с. 66]. Уся стратэгія партыі павінна была падначальвацца перш за ўсё задачам манеўравання і супрацоўніцтва розных сацыяльных груп, якія складалі масавую электаральную базу ХДП (тут былі прадстаўлены працоўныя і прадпрымальнікі, сяляне і гарадскія слаі) [15, с. 23–24]. Працоўныя атрымалі запэўніванні, што яны будуць удзельнічаць у кіраванні прадпрыемствамі. Сялянам паабяцалі частковую аграрную рэформу і ліквідацыю засілля латыфундыяў. Прадпрымальнікі і зямельныя ўласнікі былі перакананыя ў тым, што эканамічная сістэма краіны, яе палітычны лад не будуць зменены шляхам нацыяналізацыі і правядзення радыкальнай аграрнай рэформы. Так, прадстаўнікі розных слаёў грамадства Італіі бачылі ў ХДП партыю сваіх інтарэсаў.

Па-трэцяе, выбаршчыкаў прыцягвалі да партыі, з аднаго боку, надзея на адраджэнне дэмакратыі пасля 20 гадоў фашысцкага рэжыму, а з іншага боку — боязь радыкалізму левых партый (у момант разбурэння фашызму прадстаўнікі буйнога бізнесу прынялі варыянт пасляваеннага будаўніцтва, бачучы ў дэмахрысціянскіх партыях адзіную сілу, якая магла б супрацьстаяць радыкальнаму камуністычнаму руху).

Акрамя таго, пасля разбурэння аўтарытарных рэжымаў шмат у якіх краінах Еўропы (перш за ўсё ў пацярпелых паражэнне ў вайне краінах — Германіі, Аўстрыі, Італіі) панавалі дэмахрысціянскія партыі. Для людзей, перажыўшых беды вайны, павялічвалася прыцягальнасць ідэй хрысціянскага гуманізму, міласэрнасці і справядлівасці.

Усё гэта можа служыць тлумачэннем сілы і ўстойлівасці існавання створанай ХДП сістэмы ўлады.

ХДП узнікла як складаны і супярэчлівы палітычны механізм, з аднаго боку, закліка765 адлюстроўваць у свецкай палітычнай сферы інтарэсы і патрабаванні шырокага кола каталікоў, а з другога — як адзіная на той момант партыя, якой палітычная эліта магла даверыць місію па палітычным, эканамічным і маральным адраджэнні краіны пры падтрымцы каталіцкай царквы.

Усе гэтыя фактары дазволілі стаць хрысціянскім дэмакратам самай уплывовай палітычнай сілай Італіі, а лідару ХДП А. дэ Гасперы 10 снежня 1945 г. — сфарміраваць свой першы ўрад.

Такім чынам, хрысціянская дэмакратыя ўзнікла як спроба хрысціян асэнсаваць новыя рэаліі зменлівага грамадства. Першыя палітычныя аб’яднанні хрысціянскіх дэмакратаў былі створаны каля 1830 г. у Бельгіі, Францыі, Ірландыі і інш. У Італіі першая хрысціянска-дэмакратычная пар-

тыя ўзнікла ў 1919 г., праіснаваўшы аж да свайго роспуску фашысцкім урадам у 1926 г. і стаўшы своеасаблівым «ідэалагічным падмуркам» для з'яўлення італьянскай Хрысціянска-дэмакратычнай партыі. Узнікненне ХДП было падрыхтавана захаваннем ідэалагічнай аўтаноміі каталіцкага руху ў часы фашызму. Калі лічыць, што Хрысціянска-дэмакратычная партыя ў сваёй праграме аформіла настрой значнай часткі сярэдніх слаёў насельніцтва, то трэба думаць, што такія настроі скалаліся не адразу, а яшчэ ў нетрах фашысцкага рэжыму, бо ХДП мела ў краіне сапраўды шырокую электаральную базу, а яе праграмы карысталіся падтрымкай большасці насельніцтва. Вялікі дыяпазон праграмных патрабаванняў, падтрымка Ватыкана, надзея на адраджэнне дэмакратыі пасля 20 гадоў фашысцкага рэжыму, боязь радыкалізму левых партый і панаванне дэмахрысціянскіх партый шмат у якіх краінах пасляваеннай Еўропы спрыялі замацаванню вядучага становішча ХДП ў грамадска-палітычным жыцці Італіі пасля падзення рэжыму Мусаліні. «Левыя хрысціяне», прадстаўленыя Хрысціянскай левай партыяй і Сацыяльна-хрысціянскай партыяй, не здолелі стаць важнай палітычнай сілай, саступіўшы моцы ХДП — адзінай хрысціянскай партыі пасляваеннай Італіі.

### Спіс асноўных крыніц

1. Лев XIII Rerum Novarum / Лев XII // 100 лет христианского социального учения. — М. : Pax Christi, 1991. — С. 6–24.

2. Канделоро, Дж. Католическое движение в Италии / Дж. Канделоро. — М. : Издательство иностранной литературы, 1955. — 586 с.

3. Лев XIII Бессмертный Бог [Электронный ресурс] // Una Voce Russia. — Режим доступа: http://www.unavoce.ru/library/immortale_dei.html. — Дата доступа: 21.02.2016.

4. Leo XIII Graves de communi Re [Electronic resource] // La Santa Sede. — Mode of access: http://www.vatican.va/holy_father/leo_xiii/encyclicals/documents/hf_l-xiii_enc_18011901_graves-de-communi-re_en.html. — Date of access: 11.03.2016.

5. Toniolo, G. La democrazia cristiana / G. Toniolo. — Roma : Studium, 1976. — 578 p.

6. Mammarella, G. Italy After Fascism / G. Mammarella. — Notre Dame IN : Notre Dame Press, 1966. — 377 p.

7. Комолова, Н. П. Движение Сопротивления и политическая борьба в Италии / Н. П. Комолова. — М. : Наука, 1972. — 444 с.

8. Лисовский, Ю. П. Италия от фашизма к демократии: Трудные пути послевоенной перетройки / Ю. П. Лисовский. — М. : Наука, 1990. — 385 с.

9. L'onarmo: l'idea e l'opera — quarant'anni di vita. — Roma, 1962. — 541 p.

10. Fanello Marcucci, G. Documenti programmatici dei democratici cristiani (1899–1943). Documenti programmatici dei democratici cristiani, 1899–1943 / G. Fanello Marcucci. — Roma : Cinque lune, 1983. — 156 p.

11. Гайдук, В. П. Христианская демократия в Италии (60–70-е годы) / В. П. Гайдук. — М. : Наука, 1985. — 176 с.

12. Комолова, Н. П. Новейшая история Италии / Н. П. Комолова. — М. : Просвещение, 1970. — 319 с.

13. Шаронов, М. С. Коммунисты и католики в Италии. Из истории диалога (1921–1956) / М. С. Шаронов. — М. : Наука, 1973. — 359 с.

14. Гренвилл, Дж. История XX века. Люди. События. Факты / Дж. Гренвилл. — М. : Аквариум, 1999. — 687 с.

15. Васильцов, С. И. Структура избирательного корпуса рабочей партии Италии (1953–1972 гг.) / С. И. Васильцов. — М. : Наука, 1972. — 29 с.

***Christian party of Italy in the final stages of World War II***

*Christian Democracy appeared as an attempt to make sense of the new Christian realities of a changing society. The first political unions of the Christian Democrats were created around 1830 in Belgium, France, Ireland and others. In Italy, the first Christian Democratic Party emerged in 1919, existed until their dissolution by the fascist government in 1926 and became a kind of "ideological foundation" for the emergence of the Italian Christian Democratic Party. CDP had really broad electoral base in the country, and its program enjoyed the support of the majority of the population. A large range of program requirements, the support of the Vatican, the hope for the revival of democracy after 20 years of the fascist regime, the fear of radical left-wing parties and the domination Christian Democratic parties in many countries of the post-war Europe contributed to the consolidation of the leading position of the CDP in social and political life in Italy after the fall of Mussolini. "Left Christians", presented by the Christian Left Party and the Social-Christian Party failed to become an important political force, giving the power of CDP — the only Christian party in post-war Italy.*